WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

19 ЖНІЎНЯ 2011 г. ПЯТНІЦА
№ 157 (27021)

Кошт 750 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

**Надвор'е**

## ДАЖДЖЛІВА І ХАЛАДНАВАТА БУДЗЕ Ў БЛІЖЭЙШЫЯ ВЫХАДНЫЯ ДНІ

У суботу дажджы чакаюцца на большай частцы тэрыторыі. Месцамі яны будуць з навальніцамі. У асобных раёнах прагназуюцца моцныя ліўні, узмацненне ветру з парывамі да 15-18 метраў у секунду. Тэмпература паветра ў ноч на суботу складзе 11-17 градусаў цяпла. Днём будзе плюс 15-21. У нядзелю ў большасці раёнаў Беларусі пройдуць кароткачасовыя дажджы, ноччу месцамі — моцныя ліўні. У асобных раёнах прагрымяць навальніцы. На захадзе рэспублікі прагназуецца парывісты паўночна-заходні вецер. У ноч на 21 жніўня — 7-13 градусаў цяпла, днём — не вышэй за 16-22. У ноч на панядзелак чакаецца да 7-14 градусаў цяпла. Дзённая тэмпература паветра ў панядзелак будзе вагацца ад 20 па поўначы да 27 градусаў па поўдні краіны. Да сярэдзіны наступнага тыдня прагназуецца няўстойлівае надвор'е. Месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. У начны час чакаецца ад 9 да 17 градусаў. Днём у аўторак будзе 20-27, у сераду — ад 22 па паўночным усходзе да 29 вышэй за нуль па паўднёвым захадзе краіны.

**Кім быць?**

## Аграрыі — нямодныя, а эканамісты — незапатрабаваныя

**Прафесійныя памкненні маладых людзей разыходзяцца з рэальным жыццём: першыя вынікі сёлетняй уступнай кампаніі ў Магілёўскай вобласці супярэчаць сітуацыі на рынку працы.**

Самымі запатрабаванымі прафесіямі ў абітурыентаў рэгіёна па-ранейшаму застаюцца юрысты і эканамісты. Між тым, рынак працы даўно перапоўнены гэтымі спецыялістамі: напрыклад, у Магілёве ў цэнтры занятасці ёсць толькі адна вакансія юрыста на 23 суіскальнікаў, а 99 эканамістаў прэтэндуюць на 3 рэальныя працоўныя месцы.

Вельмі папулярнай з'яўляецца спецыяльнасць «Фінансы і крэдыт» у Беларуска-Расійскім універсітэце. Конкурс на платную форму дзённага навучання склаў 6 чалавек на месца: маладыя людзі (і іх бацькі) хочуць быць бліжэй да грошай. А вось, напрыклад, стаць спецыялістам у галіне сельскай гаспадаркі — сёння не самая актуальная моладзевая мара. У Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі не назіралася ажыятажу, а менавіта выпускнікі гэтай паважанай навучальнай установы маюць вялікія магчымасці для паспяховага працаўладкавання. Што датычыцца працоўных прафесій, то самымі запатрабаванымі на рынку працы і, акрамя таго, высокааплатнымі застаюцца будаўнікі.

**Ілона ІВАНОВА.**

**Наблюдательный совет ОАО «БЕЛЭНЕРГОАВТОМАТИКА»**

Сообщает о проведении **31 августа 2011 года** в 14.00 ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ по адресу: **г. Минск, ул. Омельянюка, 20, второй этаж, зал заседаний.**

Повестка дня:

1. О внесении изменений в Устав Общества, изложив его в новой редакции.

С материалами можно ознакомиться по месту нахождения Общества в рабочие дни **с 22 по 30 августа 2011 года с 08.00 до 16.00.**

Регистрация участников собрания **с 13.00 до 14.00** по месту проведения собрания.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 15 августа 2011 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.

*УНП 100064414*

## ВЯСЁЛЫЯ МАЙСТРЫХІ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Народныя майстрыхі з Клімавіч Людміла КРЫЎЦОВА і Таццяна САПАЖКОВА.**

**Абзац**

◢ **Падрыхтоўка беларускіх спартсменаў да лонданскай Алімпіяды-2012 абыдзецца ў Br40-50 млрд. Перад алімпійцамі пастаўлена задача заваяваць 25 медалёў. Прычым пяць з гэтых узнагарод павінны быць залатымі. Павялічаны памер прызавых за алімпійскія медалі — $150 тыс. за «золата», $75 тыс. за «срэбра», $50 тыс. за «бронзу».**

◢ У Мазыры лівень, які прайшоў 17 жніўня, размыў аўтамабільную дарогу. У горадзе за суткі выпала 18,9 мм ападкаў пры месячнай норме 90 мм. Магутны паток вады размыў асфальтавае палатно адной з гарадскіх вуліц, утварыўшы пралом на плошчы 12 кв.м.

◢ **У Гомельскім раёне за суткі міліцыянеры знішчылі дзве буйныя плантацыі дзікарослых канопляў агульнай плошчай каля 3 га. Адна, плошчай 0,5 га, была выяўлена каля вёскі Цагельня. Другая плантацыя (больш за 2 га) знаходзілася каля населенага пункта Сасноўка.**

◢ Дзяржаўная дапамога па доглядзе за дзіцем-інвалідам у 2012 годзе будзе ўстаноўлена ў памеры 100% бюджэту пражытковага мінімуму. Цяпер памер гэтай дапамогі складае 65% БПМ (што з 1 жніўня па 31 кастрычніка гэтага года адпавядае Br287 530).

◢ **Сёлета Беларусь у першым паўгоддзі павялічыла экспарт харчовых тавараў у параўнанні з аналагічным леташнім перыядам на 26,6% да $1881,2 млн. Імпарт за гэты перыяд узрос на 23,5% да $967,9 млн. Асноўнымі пазіцыямі беларускага экспарту харчавання заставаліся малочныя і мясныя прадукты.**

**Поўны абзац**

◢ Мэр канадскага мястэчка, размешчанага ў правінцыі Квебек, прывёз да дома былой жонкі камень вагой у дваццаць тон. Такім чынам ён вырашыў павіншаваць яе з днём народзінаў. Зараз яго могуць абвінаваціць па артыкулах за прычыненне шкоды маёмасці і дамаганне.

◢ **Сабаку пароды бладхаўнд, які пакутаваў на рэдкую афтальмалагічную хваробу — заваротам павекаў, — зрабілі пластычную аперацыю, якая выратавала яго ад слепаты. Гаспадары сабакі заплацілі за працэдуру восем тысяч фунтаў. Зараз Джуніёр адчувае сябе значна лепш.**



*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

Казімір ФАРЫНО:

# «ВЫДАТКІ НА СІСТЭМУ АДУКАЦЫІ СЁННЯ ПРОСТА КАЛАСАЛЬНЫЯ...»

**1 верасня школьны званок прагучыць для 920 тысяч беларускіх хлопчыкаў і дзяўчынак. Такім чынам кантынгент навучэнцаў агульнаадукацыйных устаноў скароціцца больш чым на 20 тысяч чалавек у параўнанні з папярэднім годам. Сітуацыя з колькасным складам вучняў беларускіх школ стабілізуецца толькі ў 2015 годзе. Аб гэтым журналістам на прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным прэс-цэнтры паведаміў намеснік міністра адукацыі нашай краіны Казімір ФАРЫНО.**

Казімір Фарыно расказаў, што колькасць першакласнікаў з кожным годам пакрысе прырастае і сёлета за школьныя парты сядуць упершыню каля 87 тысяч чалавек. Праўда, у новым навучальным годзе мы не далічымся яшчэ каля 65 школ па ўсёй краіне. Яны сталі ахвярамі дэмаграфічнай сітуацыі, у якой мы ўсе апынуліся ...

— Нам таксама шкада, калі закрываюцца школы. Аднак пры закрыцці малакамплектных школ мы маем толькі адну мэту — гэта павышэнне якасці адукацыйнага працэсу, — падкрэсліў Казімір Фарыно. — У малакамплектнай школе немагчыма якасна арганізаваць навучальны працэс. Рашэнне аб закрыцці абавязкова прымаецца з улікам аналізу дэмаграфічнай сітуацыі ў рэгіёне. І калі відавочна, што ў бліжэйшыя гады дзеці будуць папаўняць навучальную ўстанову, ніхто згоды на яе закрыццё не дасць.

Між іншым, школы ў Беларусі не толькі закрываюцца, але яшчэ і будуюцца. Так, да 1 верасня ў эксплуатацыю будуць уведзены 7 школ-навабудоўляў і яшчэ адна — да канца года. Таксама будуюцца і 15 дзіцячых садкоў, пяць з якіх ужо ўведзены, а астатнія будуць уводзіцца па графіку ў кастрычніку—лістападзе 2011 года.

Паводле слоў Казіміра Фарыно, сітуацыя па кадравым забеспячэнні дзіцячых садкоў пачала пакрысе выпраўляцца, чаму, несумненна, паспрыяла вяртанне педагогам дашкольных устаноў ранейшай працягласці іх адпачынку:

— Не буду ўтойваць, што нам хацелася б, каб больш працавала ў дзіцячых садках педагогаў з профільнай (дашкольнай) адукацыяй. Сёлета мы размеркавалі 307 маладых спецыялістаў, а заяўка была на тысячу педагогаў. Спадзяёмся, што за кошт павелічэння прыёму на спецыяльнасць «Дашкольная адукацыя» ў бліжэйшыя гады нам удасца вырашыць кадравую праблему. А пакуль што на вакантныя пасады выхавальнікаў у дзіцячых садках даводзіцца прыцягваць выпускнікоў іншых педагагічных спецыяльнасцяў, якія праходзяць адпаведную перападрыхтоўку.

Усяго ва ўстановах дашкольнай адукацыі працуюць сёння больш як 52 тысячы педагогаў. Ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі — 108 тысяч настаўнікаў, з якіх 8,6 тысячы чалавек знаходзяцца ў пенсійным узросце (7,9 працэнта ад агульнай колькасці).

Карэспандэнт «Звязды» пацікавілася ў Казіміра Фарыно, ці вядомы ўжо фармат абавязковага экзамену па замежнай мове, які ўпершыню будзе праведзены ў 2012/2013 навучальным годзе? Экзамен быў задуманы як магутны фактар стымулявання інтарэсу да авалодання замежнай мовай... І ўвогуле, ці прынеслі плён дзяленне класаў на малаколькасныя падгрупы і павелічэнне колькасці гадзін, што адводзяцца на вывучэнне замежнай мовы?

— Навучыць свабодна размаўляць на замежнай мове выпускніка агульнаадукацыйнай школы — наша задача. Таму падыходы да вывучэння замежных моў карэнным чынам змяніліся: дзейная сёння сістэма арыентавана якраз на авалоданне камунікатыўнай кампетэнцыяй, — патлумачыў Казімір Фарыно. — Недастаткова проста разумець тэксты на замежнай мове і разбірацца ў граматыцы. Для чаго мы пайшлі на дзяленне класаў на тры групы? Каб у настаўніка было больш часу для зносін з кожным вучнем, каб прымусіць усіх школьнікаў часцей размаўляць. Не сакрэт, што поспех у вывучэнні школьнікамі замежнай мовы ў немалой ступені залежыць ад прафесійнага майстэрства настаўніка, бо, акрамя стасункаў з педагогам, у дзіцяці больш няма магчымасці пачуць замежную мову. І для таго, каб вучань пачаў размаўляць, настаўнік сам павінен валодаць сучаснымі гутарковымі нормамі. А з гэтым, прызнаюся, час ад часу ўзнікаюць праблемы. І ўсё ж такі камунікатыўны падыход цалкам сабе апраўдаў. Пра гэта сведчыць і апрабацыя абавязковага выпускнога экзамену, якая прайшла напрыканцы навучальнага года. З яго матэрыяламі і рэкамендацыямі па падрыхтоўцы да вуснага экзамену настаўнікі змогуць азнаёміцца ў бліжэйшы час. Упэўнены, што мы рухаемся ў правільным напрамку.

Яшчэ адно пытанне тычылася павышэння грашовых выдаткаў на харчаванне выхаванцаў і навучэнцаў устаноў адукацыі. Ці дазволіць яно забяспечыць рацыянальнае і збалансаванае харчаванне дзяцей, асабліва з улікам росту спажывецкіх цэн на харчовыя тавары?

— Пастановай Савета Міністраў ад 6 жніўня № 1063 грашовыя выдаткі на харчаванне навучэнцаў былі павялічаны ў сярэднім на 10 працэнтаў, — паведаміў Казімір Фарыно. — Гэтыя нормы пачнуць дзейнічаць сёлета з 1 верасня. Зразумела, што ўсім нам хочацца, каб нашы дзеці за кошт бюджэтных сродкаў атрымлівалі харчаванне, якое б у поўнай ступені адпавядала натуральным нормам, устаноўленым для кожнага ўзросту. У пачатку бягучага года грашовыя нормы выдаткаў на харчаванне і сапраўды былі прыведзены ў адпаведнасць з натуральнымі нормамі. Аднак цэны растуць...Між іншым, бацькі аплачваюць харчаванне сваіх дзяцей у дашкольных установах толькі на 40 працэнтаў, а 60 працэнтаў у харчаванні складаюць дзяржаўныя датацыі. Ці правільна гэта — перакладваць увесь цяжар на плечы дзяржавы? Выдаткі на сістэму адукацыі сёння проста каласальныя: гэта і бясплатны падвоз вучняў да школы, і аплата толькі паловы ад кошту падручнікаў і шмат чаго іншага. Для прыкладу, у Нідэрландах плата за дзіцячы садок складае ад 600 да 800 еўра штомесяц.

Казімір Фарыно не стаў адмаўляць той факт, што ў міністэрстве зараз разглядаюцца прапановы па аптымізацыі ўдзелу бацькоў у аплаце харчавання дзяцей у дашкольных установах з улікам узроўню даходаў сям'і. Аднак калі такое рашэнне можа быць прынята, намеснік міністра дакладна сказаць не змог, падкрэсліў толькі, што 1 верасня для бацькоў у аплаце садка нічога не зменіцца. У гэтым можна быць упэўненымі. Таксама Казімір Фарыно паабяцаў, што да павышэння грашовых нормаў выдаткаў на харчаванне Міністэрства адукацыі будзе пастаянна вяртацца.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Даведка «Звязды»:**

**Грашовыя нормы выдаткаў на харчаванне выхаванцаў дзіцячых дашкольных устаноў з 1 верасня 2011 года:**

- *узрост выхаванцаў 1-2 года — 4580 рублёў ва ўстановах з працягласцю работы 10,5 гадзін і 5790 рублёў з працягласцю работы 12 гадзін;*
- *ад 3 да 6 гадоў — адпаведна 5930 і 7220 рублёў.*

У санаторных яслях-садках, санаторных садках і санаторных групах:

- *1—2 года — 6720 рублёў*
- *ад 3 да 6 гадоў — 8390 рублёў.*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЕЎРА І ЕЎРАСАЮЗ — НА КРАЮ БЕЗДАНІ?

**Еўра і Еўрапейскі саюз «апынуліся цяпер на краю бездані», заявіў былы кіраўнік Еўракамісіі і адзін са стваральнікаў еўразоны Жак Дэлор. Інтэрв'ю з ім публікуе швейцарская газета Le Temps.**



«Скажу ўсю праўду: еўра і Еўрасаюз знаходзяцца на краю бездані, — падкрэсліў Жак Дэлор. — І для таго, каб у яе не зваліцца, ёсць вельмі простае выйсце: або краіны, члены ЕС, павінны пагадзіцца на цесную каардынацыю сваёй эканамічнай палітыкі, або перадаць новыя паўнамоцтвы адзіным органам Еўрасаюза».

Адначасова Дэлор выказаўся за сумесныя гарантыі ўсіх дзяржаў зоны еўра па дзяржзапазычанасці на суму да 60% ад яе сукупнага ВУП. «Частковае аб'яднанне абавязкаў дасць магчымасць пагасіць цяперашні фінансавы крызіс у еўразоне», — падкрэсліў ён.

### ЧАВЕС ВЯЛІКАБРЫТАНІІ: ВЯРНІЦЕ 99 ТОН ЗОЛАТА!

Урад Венесуэлы запатрабаваў вярнуць у краіну 99 тон золата, якія захоўваюцца на яго рахунках у Банку Англіі. Прадстаўнік Банка Англіі адмовіўся зрабіць якія-небудзь каментарыі адносна запыту з боку Каракаса, а таксама назваць памеры венесуэльскага золата, якое знаходзіцца на рахунках банка.

### НА ДЭМАНСТРАЦЫЯХ СУПРАЦЬ ВІЗІТУ ПАПЫ РЫМСКАГА Ў МАДРЫДЗЕ ПАЦЯРПЕЛІ 11 ЧАЛАВЕК



**Іспанская паліцыя затрымала васьмярых удзельнікаў дэманстрацыі напярэдадні візіту папы Рымскага Бенедыкта XVI, паведамляе Associated Press са спасылкай на мясцовыя ўлады. У сутыкненнях актывістаў з паліцыяй пацярпелі 11 чалавек, сярод якіх двое паліцэйскіх.**

Шматтысячная акцыя пратэсту пачалася ў сераду вечарам у цэнтры горада напярэдадні прыбыцця Бенедыкта XVI. Актывісты незадаволеныя тым, як дорага абыходзіцца пацярпелай ад эканамічнага крызісу Іспаніі візіт кіраўніка каталіцкай царквы: чатырохдзённая паездка Папы Рымскага ў Мадрыд каштавала падаткаплацельшчыкам каля 73 мільёнаў долараў. Прадстаўнікі царквы запэўніваюць, што вялікая частка гэтай сумы будзе папоўнена за кошт прыбыткаў ад паломнікаў, якіх у сталіцу Іспаніі прыбыло некалькі сотняў тысяч, аднак людзі, якія выйшлі на вуліцы горада, упэўнены, што гэта не так. Нягледзячы на тое, што акцыя планавалася як мірнае шэсце, сутыкненняў з паліцыяй пазбегнуць не атрымалася.

Аляксандр БАРОЎСКІ:

# «КАЛІ ЁСЦЬ ДВА ЖАНІХІ, ТО ЧАМУ НЕ ЖЫЦЬ З ДВУМА?»

**ГЕНЕРАЛЬНЫ дырэктар МАЗа Аляксандр БАРОЎСКІ расказаў журналістам, у якой стадыі знаходзіцца магчымае стварэнне холдынгу Мінскага аўтамабільнага завода і КамАЗа. Паводле яго слоў, згодна з даручэннем кіраўніка дзяржавы, створаны камісіі і вызначана незалежная ацэначная кампанія, якая сёння праводзіць ацэнку МАЗа. Пры гэтым ён нагадаў, што таксама паступіла прапанова ад «Групы ГАЗ», у сувязі з чым створана працоўная група і ў гэтым напрамку. Вынікі працы па гэтых двух напрамках, як мяркуе гендырэктар МАЗа, павінны быць падведзены да канца года. Разам з тым Аляксандр Бароўскі выказаў і сваю асабістую думку на гэты конт:**

— Я магу агучыць сваю новую пазіцыю, якую я ўжо агучваў ва ўрадзе. Я чалавек з Бабруйска, мяне навучылі там мудра мысліць: КамАЗ прапануе стварыць нам холдынг (мы аддаём туды 48%, і яны 48%), «Група ГАЗ» просіць прадаць 25% акцый. Ну дык калі мы — нявеста, і ёсць два жаніхі, то чаму не жыць з двума жаніхамі? Трэба стварыць і холдынг, і 25% прадаць «Групе ГАЗ», — прапанаваў ён, але дадаў, што ўсё роўна 100% акцый МАЗа зараз належаць дзяржаве, і таму толькі яна можа вырашаць, у які бок трэба рухацца.

Дарэчы, па словах генеральнага дырэктара МАЗа, прадпрыемства сем месяцаў 2011 года адпрацавала досыць паспяхова: аб'ёмы таварнай прадукцыі склалі 160,8%, а экспарт — 220%. Прычым, калі глядзець на працу Мінскага аўтамабільнага завода за апошнія 1,5 года, то экспарт павялічыўся ажно ў 5 разоў:

— Мы за 1,5 года павялічылі экспарт на 500%, і я не баюся гэтай лічбы. Гэта тое, што трэба сёння краіне — валюта, — адзначыў Аляксандр Бароўскі.

Рэнтабельнасць на МАЗе складае больш за 20%, сярэдняя зарплата — больш за 3 мільёны. Няма праблем і з рэалізацыяй прадукцыі: запасы гатовай прадукцыі ніжэй за норму, а на некаторыя мадэлі існуюць чэргі з пакупнікоў.

Пры гэтым на заводзе, як адзначыў гендырэктар, асаблівую ўвагу надаюць распрацоўцы новых мадэляў. Аляксандр Бароўскі паабяцаў, што прэзентаваны капотны грузавік (пра яго мы пісалі ў мінулым нумары — **Аўт.**) не апошняя навінка ў бліжэйшы час. У першым квартале наступнага года будзе створаны яшчэ адна версія «капотніка» — міжнародная з вялікім спальнікам. Таксама ў наступным годзе будзе прэзентавана і яшчэ адна версія МАЗаўскага грузавіка — ужо традыцыйная «бескапотная», але таксама з вялікім спальнікам. А ўжо ў кастрычніку 2011 года на Магілёўтрансмашы пачнецца выпуск невялічкіх грузавікоў і мікрааўтобусаў, якія былі прэзентаваны ў канцы мінулага года. Дарэчы, Аляксандр Бароўскі лічыць вельмі перспектыўным выпуск мікрааўтобусаў у Беларусі:

— Гэта не кітайская мадэль, а японская. Разумееце, нам стварыць мікрааўтобус вельмі нявыгадна эканамічна. Я праехаў Еўропу, я хацеў стварыць мікрааўтобус накшталт «Мерседэса», «Фальксвагена». Ведаеце цэны? 30-35 тысяч долараў атрымліваецца. Хто яе купіць у мяне? Тады пайшлі ў іншы бок, пачалі працаваць праз іспанцаў, і мы знайшлі тую цану, якая нас задаволіла. Я пакуль не магу гэтую цану назваць, але яна будзе даступная для любога нармальнага чалавека. Асабліва калі ўлічваць сённяшнія мытныя пошліны, — сказаў гендырэктар МАЗа і запэўніў журналістаў, што якасць гэтых мікрааўтобусаў будзе нармальная.

Расказаў таксама Аляксандр Бароўскі і пра супрацоўніцтва з Мінскім маторным заводам. У прыватнасці, МАЗ імкнецца да таго, каб займець усю лінейку рухавікоў для сваёй тэхнікі беларускай вытворчасці:

— Сёння ўрад просіць і патрабуе ад нас, каб мы болей бралі беларускае і меней трацілі валюты. І мы б хацелі мець свой беларускі рухавік. Гэта мая задача №1 — каб мы ўсю лінейку рухавікоў не ў Яраслаўлі куплялі, не Cummins, а тут, у Беларусі. Гэта за адзін год не зробіш, гэта задача пяцігодкі. Чаго раней мы да гэтай мэты не падыходзілі? Бо вазьміце любы аўтамабільны завод — ён мае свой рухавік, а то і каробку: КамАЗ, «Мерседэс». А мы пакуль толькі маем маленькі рухавік свой, але нам патрэбны і сярэднія рухавікі, і цяжкія. І трэба думаць наконт выпуску сваёй каробкі, — сказаў ён.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

## Извещение о проведении 19 сентября 2011 года открытого аукциона по продаже имущества Белкоопсоюза

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование и характеристики продаваемого имущества)** | - цех розлива минеральной воды общей площадью 2303,8 кв. м, инвентарный номер 623/С-36639, литер 1В1/пан;<br>- склад тары площадью 275,4 кв. м, инвентарный номер 623/С-36638, литер 2В1/к;<br>- зарядная электрокар общей площадью 64,6 кв. м, инвентарный номер 623/С-36640, литер 3В1/к;<br>- проходная общей площадью 5,3 кв. м, инвентарный номер 623/С-36637, литер 4В1/к<br>- резервуар для воды, год ввода в эксплуатацию 1983, площадь застройки 70 кв. м; инвентарный номер 623/С-36652;<br>- насосная (артскважина), год постройки 1983, площадь застройки 94 кв. м;<br>- очистные сооружения, год постройки 1983, площадь застройки 25 кв. м; |
| **Сведения о земельном участке** | - земельный участок площадью 1,4039 га, кадастровый номер 625682506101000166, назначение – для содержания и обслуживания зданий и сооружений;<br>- земельный участок площадью 0,0534 га, кадастровый номер 625682506101000167, назначение – для содержания и обслуживания скважины. |
| **Местонахождение продаваемого имущества** | Минская область, Узденский район, Озерский сельсовет, д. Королево |
| **Продавец** | ЧУП «Пищевой комбинат Белкоопсоюза», 220075, проспект Партизанский, 168, г. Минск, телефон (017)345-85-85 |
| **Организатор аукциона** | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, телефон (017)227-48-36 |
| **Начальная цена предмета торгов без учета НДС** | 1 425 613 200 белорусских рублей |
| **Сумма задатка** | 140 000 000 белорусских рублей |

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет № 3012104971019, в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Банк», г. Минск, код 153001369, получатель - УП «Минский городской центр недвижимости» УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Победитель торгов (покупатель) оплачивает продавцу НДС в размере 20 процентов от наивысшей (окончательной) цены, зафиксированной в протоколе о результатах аукциона, а также возмещает затраты на организацию и проведение торгов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 10 рабочих дней с даты проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Аукцион состоится 19 сентября 2011 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с 22.08.2011 по 16.09.2011 включительно в рабочие дни с 09.00 до 17.00 (в пятницу – до 13.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефон для справок: (017)227-48-36.**
**Сайт в интернете: www.mgcn.by.**

## ХОЗЯЙСТВЕННЫЙ СУД ГОРОДА МИНСКА ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО ЗАО «БЕЛАВТОИМПЭКС»

**Лот № 1.** Автомобиль Мерседес 1726, 1990 года выпуска, цвет — желтый, производитель — Германия, комплектация — платформа двухъярусная, полная масса (кг) — 17000, число осей — 2. Начальная стоимость — 36 233 480 белорусских рублей. Минимальная величина первого шага составляет 5% стоимости имущества в размере 1 811 674 белорусских рубля.

**Лот № 2.** Прицеп Лохр 10/4CS, 1990 года выпуска, цвет — желтый, комплектация — платформа двухъярусная, полная масса (кг) — 14050, число осей — 2. Начальная стоимость — 27 789 476 белорусских рублей. Минимальная величина первого шага составляет 5% стоимости имущества в размере 1 389 474 белорусских рубля.

Стоимость имущества указана с учетом НДС.

**Подробная информация об имуществе размещена на сайте: http://minsk.court.by/,**

а также в помещении хозяйственного суда г. Минска: г. Минск, ул. Академическая, 15/1.

**Торги состоятся 15.09.2011 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Академическая, 15/1, каб. 201.**

**За дополнительной информацией обращаться: судебный исполнитель Есина Л.С., тел.-факс: 294 93 84, (029) 177 32 54; ст. судебный исполнитель Вярьвильский Д.А., тел. 294 93 67.**

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть перечислен на депозитный счет хозяйственного суда города Минска № 3642900000072 в ОАО «АСБ «Беларусбанк» Минск, код 795, УНП 101541763 не позднее чем за 24 часа до начала проведения торгов.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

## БЕЛАРУСБАНК

**С 19 августа 2011 года ОАО «АСБ Беларусбанк» увеличивает процентные ставки по вкладам в белорусских рублях и устанавливает в следующих размерах:**

**«Накопительный» — 30,5% годовых;**

**«Новый-2010»** — в течение первых 3-х месяцев хранения фиксированный доход — **30% годовых** (по вновь принимаемым вкладам);

**Сберегательный сертификат** на 15 дней — **26% годовых,**
на 2 месяца — **27% годовых.**

Информация о процентах, выплаченных по различным видам вкладов, депозитов в течение последнего финансового года с разбивкой по месяцам, опубликована в газете «Звязда» № 106 (26970) за 9 июня 2011 г., а также размещена на сайте

**www.belarusbank.by**

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь. Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

ISSN 1990 - 763X

**Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.08.2011 г. (для б/н разлікаў)**

| | |
|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША ........ 5 017,00 | 1 чэшская крона ........ 296,78 |
| ▲ 1 еўра ........ 7 229,00 | 1 польскі злоты ........ 1 749,49 |
| 1 латвійскі лат ........ 10 206,49 | ▼ 1 расійскі рубель ........ 173,53 |
| 1 літоўскі літ ........ 2 097,58 | 1 украінская грыўня ........ 627,32 |

**Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 28,9115 |
| 10 UAH | 36,1484 |
| 10000 BYR | 57,6386 |
| EUR | 41,6355 |

# ПАНЯДЗЕЛАК, 22 ЖНІЎНЯ

### ПЕРШЫ

**6.00, 7.10, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.40** Навіны.
**7.05, 8.05, 18.50** «Зона Х».
**7.30, 8.25, 11.50** «Дзелавое жыццё».
**8.30** Дак. серыял «Гараджане-2011».
**9.10, 19.55 Серыял «Маргоша».**
**10.05, 17.05 Серыял «Маршрут міласэрнасці».**
**11.00, 18.00 Серыял «Маруся. Вяртанне».**
**12.10 Меладрама «Сястрыца».**
**13.50** Сінематэка.
**14.30** Nota Bene.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.35 Камедыя «Прышэльцы на гарышчы».**
**19.30** Арэна.
**21.00** «Панарама».
**21.45** Камандзіроўка.
**21.55 Баявік «Не памірай у адзіночку».**
**23.50** Дзень спорту.
**0.00** «У пошуках ісціны». «Ганна Яраслаўна: прыватнае жыццё каралевы Францыі».

### АНТ

**6.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00** (з субцітрамі), **18.00, 20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.10** «Смак».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10 Серыял «Страчаны свет».**
**12.05** «Дэтэктывы».
**12.40** «Тайны патанулых караблёў».
**13.10** «Кантрольная закупка».
**13.45** «Модны прыгавор».
**14.50** «Зразумець. Дараваць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.15 Серыял «Заручальны пярсцёнак».**
**18.20 Серыял «Каралева экрана».**
**19.00** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Апошняя сустрэча».**
**22.10 Серыял «У лясах і на гарах».**
**23.05** Тэорыя неверагоднасці.
**23.50** «Няхай гавораць».
**0.45** Начныя навіны.

### ЛАД

**7.00** ЛАДная раніца.
**8.00, 21.15** Тэлебарометр.
**8.05, 18.00 Серыял «Ты маё жыццё».**
**9.05, 19.00 Дэтэктыў «Жураў-2».**
**10.10** Жансавет.
**10.45** Канцэрт Phil Collins. Finally... The First Farewell Tour.
**12.50** «Лабірынты мастацкай культуры Заходняй Беларусі». Частка 1-я.
**13.20 Камедыя «Воблака 9».**
**15.05** Гадзіна суда. Справы сямейныя.
**16.10** Урачэбныя тайны з доктарам А. Цярэшчанкам.
**16.45** Урачэбныя тайны +.
**17.00, 0.20 Серыял «Анатомія Грэй-5».**
**20.00** Беларуская часінка.
**21.00** Калыханка.
**21.20** КЕНО.
**21.25, 23.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Агляд тура.
**21.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Манчэстэр Юнайтэд—Тотэнхем.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.35** «Вялікае снеданне».
**10.05** «Зялёны агурок. Карысная перадача».
**10.40 «Нашы суседзі». Серыял.**
**11.30, 14.45** Красуні! Міс-Мінск-2011 — кастынг.
**11.40, 17.30** «Званая вячэра».
**12.35** «Вялікі горад».
**13.10** «Далёкія сваякі».
**13.50** «Зорны рынг».
**14.55** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**16.00** «Я — падарожнік».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.10** «Наша справа».
**18.30 «Агонь кахання». Серыял.**
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Добры вечар, малы».
**20.25 Маст. фільм «Алігарх».**
**23.00** «Сталічны футбол».
**23.30** «Тайны свету з Ганнай Чапман».

### МІР

**5.00, 6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 15.00, 17.00, 18.00, 21.00, 22.00, 23.00, 0.00, 1.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**5.05** «Мільён пытанняў пра прыроду».
**5.20, 15.25** «Дом з гісторыяй».
**6.05** «Цік-так».
**6.20** М/с «Папялушка».
**7.05 Серыял «Нашы суседзі».**
**8.05, 22.05** «Жывая гісторыя».
**9.05** Падагульняючая «Разам».
**10.05 Серыял «Багатая і каханая».**
**11.05 Маст. фільм «Прызначэнне».**
**13.05** М/с «Прыгоды майстра Кун-Фу».
**13.30 Серыял «Старшакласнікі».**
**14.05, 4.00 Серыял «Дружная сямейка».**
**16.05, 17.05 Серыял «Агонь кахання».**
**18.25** «Акцэнты».
**18.40, 3.00** «Агульны інтарэс».
**19.00, 2.30 Серыял «Мужчыны не плачуць».**
**19.50, 2.10** «Слова за слова».
**21.20, 3.30** «Свет спорту».
**23.05 Маст. фільм «Візіт дамы».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 11.10, 14.10, 18.55, 21.00, 23.50** «Надвор'е».
**7.05** «На рыбалку з Юрыем Заслаўскім».
**7.20 Драма «Валькірыя».**
**9.15 Серыял «Сакрэтны палігон».**
**9.40, 13.50** «Кінаблакнот».
**10.00** «К-відэа» для дзяцей».
**10.20 Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».**
**11.15 Драма «Апошні самурай».**
**14.15 Серыял «Рэмінгтан Сціл».**
**16.00** Мультпарад.
**16.55** «К-відэа» для ўсёй сям'і.
**17.00** «Мой любімы гадаванец».
**17.30** «Падарожжа са смакам».
**18.00 Серыял «Зачараваныя».**
**19.00 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.05 Камедыя «Спецзаданне».**
**22.55 Серыял «Песня лёду і полымя».**

### ВТБ

**6.00, 1.00** «PLAY».
**8.00, 18.00, 23.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00, 20.00 Серыял «Вароніны».**
**10.00, 21.00 Серыял «Крамлёўскія курсанты».**
**11.00** «Гэта маё дзіця».
**12.00, 17.00** «Хачу верыць».
**13.00 Серыял «Як сказаў Джым».**
**14.00 Серыял «Цуды.com».**
**15.00 Серыял «Ранеткі».**
**16.00** «Дэкаратыўныя страсці».
**19.00, 23.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**22.00 Серыял «Каханне не тое, што здаецца».**
**0.00 Серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**9.25** «Прамы эфір».
**10.20** «Ранішняя пошта з Ларысай Грыбалёвай».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30, 18.50 Серыял «Ефрасіння».**
**12.20, 16.20 «Кулагін і партнёры».**
**12.50** Дак. фільм «Неўзаемнае каханне. Рыма Казакова».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.25** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае».
**15.25** «З новым домам!».
**17.55 Серыял «Сёстры па крыві».**
**20.30 Серыял «Пятая група крыві».**
**22.10 Серыял «Тайная варта. Смяротныя гульні».**
**23.05** КВЗ. Першая ліга.
**23.35** «Весткі.ru».
**23.50** Дак. фільм «Чырвоная Месаліна. Дэкрэт аб сэксе».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «НТБ раніцай».
**8.35** «Кватэрнае пытанне».
**9.35, 15.35, 18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.05** Сёння.
**10.20** «Рускія сенсацыі».
**11.05** «Да суда».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.25 Серыял «Сужэнцы».**
**15.10** «Справа густу».
**16.35 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**19.35 Серыял «Расплата».**
**21.15 Серыял «Глухар. Працяг».**
**23.30 Серыял «Справа Крапівіных».**
**0.25 Серыял «Крымінальнае відэа».**

### ТНТ

**5.00** «Невытлумачальна, але факт».
**6.00, 10.10** «Нікеладэон на ТНТ».
**7.30, 17.30, 19.30 «Універ».**
**8.30, 18.00, 18.30 «Шчаслівыя разам».**
**9.40, 13.00** М/с «Пінгвіны з «Мадагаскара».
**11.30** М/с «Лунацікі».
**12.00** М/с «Том і Джэры-2».
**12.25** «Паляўнічыя на монстраў».
**13.30, 22.00, 23.00, 3.55** «Дом-2».
**14.30 Агент 007. «Заўтра не памрэ ніколі». Дэтэктыў.**
**17.00, 19.00 «Інтэрны».**
**20.00 Камедыя «Амерыканскі пірог».**
**23.30** «Сэкс» з Анфісай Чэхавай.
**0.00** «Адзінаццатая гадзіна». Дак. фільм.
**1.55** «Камедзі Клаб».
**2.55** «Сябры».

### ІНТЭР+

**6.30, 7.10, 7.35, 8.10, 8.35** З новай раніцай.
**7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 12.00** Навіны.
**9.10, 18.30, 1.30** Арол і рэшка.
**10.00, 23.00 Маст. фільм «Жыццё Кліма Самгіна».**
**11.15, 20.30 Серыял «Заручальны пярсцёнак».**
**12.15, 0.15** Школа доктара Камароўскага.
**12.45, 4.40 Маст. фільм «Узнагародзіць (пасмяротна)».**
**14.10, 0.45** Крымінальныя справы.
**14.55** Украінская топ-дваццатка.
**16.10 Маст. фільм «Эсперанса».**
**19.15, 2.15 Серыял «Час кахаць». 1-я серыя.**
**20.00, 3.00** «Падрабязнасці».
**21.15, 3.30 Маст. фільм «Сваты». 1-я серыя.**
**22.25** Агенты ўплыву.
**6.05** Купаж.

### КУЛЬТУРА

**6.00** «Еўраньюс».
**9.00, 14.50, 18.30, 22.30** Навіны культуры.
**9.15, 0.00, 1.50** Праграма перадач.
**9.25 «Магістраль». Маст. фільм.**
**11.00** «Зараджэнне мастацтва». Дак. фільм.
**11.50, 1.25** Вялікія раманы XX стагоддзя.
**12.15** «Лінія жыцця».
**13.10** «Гаспадыня дзіцячага дома». Фільм-спектакль. Частка 1-я.
**15.00** «Казкі Андэрсэна». М/с.
**15.25 «Прыгоды Тома Соера і Гекльберы Фіна». Маст. фільм. 1-я серыя.**
**16.40, 0.55** «Жывёлы: цуды здымак». Дак. серыял. 1-я серыя.
**17.10** «Тамерлан». Дак. фільм.
**17.15** Майстры фартэпіяннага мастацтва.
**18.45** «Станіслаў Растоцкі». Дак. фільм.
**19.25** «Машына часу». Дак. фільм. 1-я серыя.
**20.20** «Гісторыя кінаначальнікаў, або Будаўнікі і перабудоўшчыкі». Дак. серыял. 1-я серыя.
**21.05 «Дэвід Коперфільд». Маст. фільм. 1-я серыя.**
**22.00** «Хто мы?».
**22.50 «Ля самага сіняга мора». Маст. фільм.**
**0.05** «Сусветныя скарбы культуры».
**0.20** Музычны момант.

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Да і пасля...». Год 1983.
**5.45** «Казачнае падарожжа містэра Більба Бегінса, Хобіта, праз дзікі край, чорны лес, за туманныя горы». Спектакль.
**6.50** «Брава». 1992 год.
**8.00, 20.00, 2.00** «Мінулы час».
**9.00 «The Beatles: Help!». Маст. фільм.**
**10.45** «Акцёры і лёсы». 1994 год.
**11.00** «На эстрадзе Уладзімір Вінакур». 1982 год.
**12.00, 21.00** «Народжаны ў СССР».
**12.55** «Шэсць песень на біс». 1996 год.
**14.00** «Быў час».
**15.00** Юбілей Музліма Магамаева. 1993 год.
**16.30** «Спявае Валерый Лявонцьеў». 1988 год.
**17.00** «Кліч джунгляў». 1994 год.
**17.40** «Міжнародны турызм у СССР». 1979 год.
**18.15** «Вясёлы агляд». Фільм-канцэрт. 1976 год.
**18.40** «Сэрца не камень». 1-я частка. Спектакль. 1989 год.
**22.00** «Зоркі польскай эстрады». Фільм-канцэрт. 1985 год.
**23.00** «Майстры мастацтваў». 1981 год.
**0.10** «Арт-кур'ер». 1994 год.
**0.40 «Стаянка цягніка — дзве хвіліны». Маст. фільм.**
**3.00** «Колба часу».
**4.00** «Жадаем вам...». 1985 год.

### MTV

**5.00, 2.30** Music.
**6.00** Стэрэа_раніца.
**8.10** Руская дзясятка.
**9.10** News блок Weekly.
**9.40, 12.30, 15.30, 17.00, 1.30** Вольны.
**10.10, 19.10** Дрэнныя дзяўчынкі.
**11.00, 21.00 «90210: Новае пакаленне». Серыял.**
**11.50** «13 кіналаж».
**12.20, 22.50** News блок.
**13.00** У гасцях у продкаў.
**13.20, 1.00** Тайныя спакусы курортнага гатэля.
**13.50** Наступны.
**14.10** Спатканне на выжыванне.
**14.40** Вобыск і спатканне.
**15.00** Шалёныя продкі.
**16.00** Замуж за мільянера.
**17.30** Школа хуліганаў.
**18.20** Багатыя і прыгожыя.
**20.00** News блок XXL.
**21.50 «Сэкс у вялікім горадзе». Серыял.**
**23.00 «Найгоршы тыдзень майго жыцця». Серыял.**
**23.20 «Клініка». Серыял.**
**23.50** American Idol.
**0.40** Трэндзі.
**2.00** Зоркі на далоні.

### НАША КІНО

**6.30, 12.30** Камедыя «Кар'ера Дзімы Горына».
**8.30, 14.40** Камедыя «Сабака на сене».
**10.45, 16.55** Дэтэктыў «Начное здарэнне».
**14.10** Плюс кіно.
**18.30, 0.30** Дэтэктыў «Справы даўно мінулых дзён...».
**20.30, 2.30** Маст. фільм «І на камянях растуць дрэвы».
**22.55, 4.55** Меладрама «Каханне. Чакаю. Лена».

### ДОМ КІНО

**3.00, 11.00, 19.00** Серыял «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева».
**3.40** Новы хіт. Крымінальная драма «Чацвёртая група».
**5.35** Камедыя «Да чорнага мора».
**6.45** Драма «Сябар».
**8.10** Золата «Масфільма». «Гісторыя Асі Клячынай, якая кахала, ды не выйшла замуж».
**9.45** Камедыя «Непапраўны хлус».
**11.40** Меладрама «Не было клопату».
**12.50** Золата «Масфільма». «Зімовы вечар у Гаграх».
**14.20** Меладрама «Здзяйсненне жаданняў».
**15.55** Камедыя «Гараж».
**17.35** Новы хіт. Баявік «Параграф 78».
**19.40** Новы хіт. Меладрама «Сабака Паўлава».
**20.55** Дэтэктыў «Няскончаная вячэра».
**23.05** Меладрама «Звычайны чалавек».
**0.45** Мюзікл па-руску «Скарбонка».

### ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

**5.00, 9.00, 13.00** Фільм-казка «Пярсцёнкі Альманзора».
**6.05, 10.05, 14.05** М/с «Самы маленькі гном». Зборнік м/ф: «Не падабаецца — не слухай», «Чужы голас», «Пра паласатае сланяня».
**7.00, 11.00** Казкі рускіх пісьменнікаў. «Дванаццаць месяцаў».
**7.55, 11.55** Казкі замежных пісьменнікаў. «Зачараваны хлопчык». Зборнік м/ф: «Казка пра добрага насарога», «Ахвотны да казак».
**15.00** Кінааповесць «Трэнер».
**16.20** М/с «Прышэлец у капусце». Зборнік м/ф: «Івашка і Баба-Яга», «Сіні капялюшык».
**17.00** М/с «Німбалы». Рускія народныя казкі. «Маладзільныя яблыкі». М/ф «Капітан Тусі».
**18.00** «Урокі цётачкі Савы». М/ф «Чалавек з дзіцячым акцэнтам».

### 20.25 ФІЛЬМ ДНЯ

**«АЛІГАРХ» (РАСІЯ—ГЕРМАНІЯ—ФРАНЦЫЯ, 2002 г.)**

Расія. Гісторыя жыцця. Час змен, якія незваротна змянілі краіну і ўсіх нас. Гісторыя кахання. Ён быў гатовы пакласці ўвесь свет да яе ног. І мог сабе гэта дазволіць. Гісторыя грошай. Вялікія грошы зарабіць можна. Але як потым застацца ў жывых?..



**Рэжысёр** — Павел Лунгін. **У ролях:** Уладзімір Машкоў, Марыя Міронава, Андрэй Краско, Аляксандр Балуеў, Уладзімір Сцяклоў.

### ТЭЛЕКЛУБ

**19.00, 1.00** Серыял «Кацярына».
**20.00, 2.00** Серыял «Бомж».
**21.00, 3.00** Серыял «Гончыя-2».
**22.00, 23.30** Серыял «Сямнаццаць імгненняў вясны».

### ТБ3

**5.00** М/ф.
**5.30** Серыял «Трэцяя планета ад Сонца».
**6.00, 15.00** «Як гэта зроблена».
**6.30** Дак. фільм «Экстрасэнсы супраць злачынцаў».
**7.00, 14.00** Серыял «Круза».
**8.00** Дак. фільм «Страчаныя светы».
**9.00** Маст. фільм «Прыстанак зла-3».
**11.00, 17.00** Серыял «Ангар 13».
**12.00** «Далёка і яшчэ далей».
**13.00** Дак. фільм «Чалавек: права на вечнае жыццё».
**15.30** Дак. фільм «Па законе крыві».
**16.00** Дак. фільм «Праўда пра НЛА».
**18.00** Серыял «Косці».
**19.00** Дак. фільм «Палюбоўніцы Раманавых».
**20.00** Серыял «Тайны Хэйвена».
**21.00** Маст. фільм «Змрочная зона».
**23.00** Серыял «Застацца ў жывых».
**0.00** Серыял «Андрамеда».
**0.45** Маст. фільм «Шоўк».
**3.00** Дак. фільм «Цывілізацыя даледніковага перыяду».
**4.00** Серыял «Танга з анёлам».

### ТБ-21

**9.00, 17.00, 1.00** Серыял «Навара».
**10.35, 18.35, 2.35** Камедыя «Віёла цалуе ўсіх».
**12.15, 20.15, 4.15** Меладрама «Прагулка».
**13.50, 21.50, 5.50** Камедыя «Ліверпульская дзева».
**15.25, 23.25, 7.25** Драма «Вайна Раяна Дэніэлса».

### ТБ1000

**3.00, 21.10** Драма «На поўдзень».
**5.00** Драма «Пахаваны заўжыва».
**6.50** Драма «Становячыся Джэйн Осцін».
**9.00** Меладрама «Гувернантка».
**11.10** Камедыя «Каханне і іншыя катастрофы».
**13.00** Камедыя «Звярынец».
**15.00** Драма «13 размоў пра адно».
**17.00** Драма «Бляск».
**19.00** Баявік «Працяглы пацалунак нанач».
**23.10** Драма «Апошні бой».
**1.10** Драма «Калядны катэдж».

### DIVA UNIVERSAL

**5.00, 9.10, 0.50** «Джордан расследуе».
**5.50, 12.30, 18.20** «Дамы сям'і Гілмор».
**6.40, 10.50** «Сэкс у вялікім Парыжы».
**7.30, 20.50** «Сапраўдныя хатнія гаспадыні Нью-Джэрсі».
**8.20, 20.00** «Нявеста для мільянера».
**11.40, 19.10** «Сапраўдныя хатнія гаспадыні Нью-Ёрка».
**13.20** Драма «Спытайце Сіндзі».
**15.00** Драма «Смелая новая дзяўчына».
**16.40** Копы-навабранцы.
**21.40** Маст. фільм «100 праблем і дзяўчына».
**23.15** Драма «Паміж братамі».
**1.40** «Быць Эрыкай».

### РАМАНТЫКА

**7.00, 21.20, 5.20** «Тайна Лауры».
**7.55, 10.40, 20.30** «Доля-ліхадзейка».
**8.50, 14.10, 16.55, 0.55** «Дзеля кахання Глорыі».
**9.45, 15.05, 3.35** «Мая Папялушка».
**11.30, 17.45, 2.40** «Дваяжэнец».
**12.25, 1.50, 6.10** «Плата не па заслугах».
**13.20, 23.05, 4.30** «Тайны кахання».
**16.00, 19.35, 22.10** «Амазонія».
**0.00** «Мужчынскія гісторыі, адрасаваныя жанчынам».

### AXN-SciFi

**0.05, 7.20** Зорны крэйсер Галактыка.
**0.50** Вузы крыві.
**1.35, 10.15** Фактар страху.
**2.20, 3.50, 11.00, 16.15** Чорная лагуна.
**3.30, 6.30, 12.20, 14.45** Паляўнічыя на прывідаў.
**5.00, 13.30** Зорны шлях.
**5.40, 14.00, 17.30** На краі Сусвету.
**9.40** Зорныя вароты.
**14.35** Зорны дэсант.
**15.05** Сшытак смерці.
**15.30, 21.40** Дзённікі вампіра.
**16.40, 23.50** Змярканне ў Вальмонце.
**18.20** Тайны Смалвіля.
**19.15, 22.15** Звышнатуральнае.
**20.00** Візіцёры.
**23.05** Гарады падзямелля.
**23.55** Страшна цікава.

### EUROSPORT

**9.30** Матаспартыўны часопіс.
**9.45, 16.00, 1.00** Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі.
**11.00, 15.00** Веславанне на байдарках і каноэ. Чэмпіянат свету на гладкай вадзе.
**12.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры.
**13.30, 19.00** Скачкі ў ваду са скалы.
**14.00** Тэніс. Турнір WTA. Фінал.
**18.45, 23.30** Футбол. Еўрагалы.
**19.30** Футбол. Кубак свету (U-20). Матч за 3-е месца.
**20.30, 23.45** Футбол. Кубак свету (U-20). Фінал.
**21.45** Вось гэта дзіва!!!
**22.00** Пра рэстлінг.

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00, 17.00** Расследаванні авіякатастроф.
**6.00, 9.00, 14.00** Самыя небяспечныя жывёлы.
**7.00, 12.00** Цар кракадзілаў.
**8.00, 13.00** Кракадзілавыя разборкі.
**10.00, 16.00** Ліхтугі за мяжой.
**11.00, 19.00, 4.00** Суперзбудаванні.
**18.00, 1.00** Ідэальная зброя.
**20.00, 23.00, 2.00** Мяжа.
**21.00, 0.00, 3.00** Горшыя турмы Амерыкі.
**22.00** Забароны.

### DISCOVERY

**7.00, 16.35** «Пятая перадача».
**7.25, 12.00, 2.55** Крутыя выбухі.
**8.20, 19.00, 5.10** «Як гэта працуе».
**8.50, 19.30, 5.40** З чаго гэта зроблена?
**9.15, 18.00, 3.50** Разбуральнікі легенд.
**10.10, 15.40, 6.05** Махінатары.
**11.05** Выжыць любой цаной.
**12.55** «Справа тэхнікі!».
**14.45, 20.00, 1.00** «Top Gear».
**17.05** Брудная работка.
**21.00, 2.00** «Палёты ўглыб Аляскі».
**22.00** «Небяспечнае ўзбярэжжа».
**23.00** Рачныя монстры.
**0.00** «Круцей не прыдумаеш».
**4.45** «Маланкавыя катастрофы».

### ЗДАРОЎЕ

**5.00, 20.00** Генезіс здароўя.
**5.50, 20.50** Цела чалавека.
**6.30, 21.30** Колькі вам гадоў?
**7.10, 22.10** Дыялогі пра харчаванне.
**8.00, 23.00** Выдаткі вытворчасці.
**8.40, 12.50, 23.40, 3.50** Гэта карысна ведаць!
**9.50, 0.50** Не выходзячы з дома.
**10.30, 1.30** Панацэя.
**11.00, 2.00** Жаночы часопіс.
**11.40, 2.40** Я перамог гэты боль.
**12.10, 3.10** Кабінет прыгажосці.
**13.45, 15.45, 19.25, 4.45** Азбука здароўя.
**14.00** Дзіцячы ўрач.
**14.40** Будзем здаровыя.
**15.20** Шлях да здароўя.
**15.50** Найноўшыя дасягненні.
**16.30** Нетрадыцыйная медыцына.
**17.00** Заўтра ўсе будуць жыць па сто гадоў.
**18.00** Я расту.
**18.40** Энцыклапедыя памылак.
**18.55** Памылкі здароўя.
**19.30** Алергія.

### TRAVEL

**7.00, 9.00, 12.00, 16.00, 19.00, 23.00, 4.00** Сусветны падарожнік.
**8.00, 14.00** Індыйскі час.
**10.00, 0.00, 5.00** Планета ежы.
**11.00** Лепшыя падарожжы.
**13.00, 18.00** Смак.
**15.00** Чыгунка ў Солер.
**17.00, 6.00** Першакласная ПАР.
**18.30** Круіз сёння.
**20.00, 1.00** Пра галоўнае...
**21.00, 2.00** Круіз па Паўднёвым кітайскім моры.
**22.00, 3.00** Людзі мора.
**0.30, 5.30** Падарожжы вакол свету.

### ANIMAL PLANET

**7.00, 11.55** Маёнтак сурыкатаў.
**7.25, 16.00** «Самае дзікае шоу».
**7.50** Самыя неверагодныя на «Animal Planet».
**8.40, 18.20** Усё пра сабак.
**09.10, 06.10** Коткі Кло-Хіл.
**10.05** Уводзіны ў катаводства.
**11.00** «Заатур Мікаэлы».
**12.20** «SOS дзікай прыроды».
**12.50** Сабакі ў турме.
**13.45, 5.20** Паліцыя Х'юстана — аддзел па абароне жывёл.
**14.40, 20.10** Перакладчык з сабачай.
Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, а также расходах, связанных с формированием земельных участков и изменением земельных участков в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этих участков (далее – затраты на организацию и проведение аукциона) доводится до сведения участников перед началом аукциона при заключительной регистрации.

В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником (далее – претендент на покупку), предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Минский горисполком в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона по продаже предмета аукциона принимает решение о предоставлении земельного участка победителю аукциона (претенденту на покупку). Победитель аукциона (претендент на покупку) в течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения обязан внести плату за право заключения договора аренды земельного участка и возместить затраты на организацию и проведение аукциона.

Победитель аукциона (претендент на покупку) в течение одного рабочего дня со дня оплаты должен представить копии платежных документов, названных выше, Организатору аукциона, после чего, не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке в соответствии с условиями аукциона Продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а Минским горисполкомом – договор аренды земельного участка.

Оплата за недвижимое имущество производится в течение 30 календарных дней с момента подписания договора купли-продажи.

Рассрочка внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка не предусмотрена.

Порядок и срок осмотра объектов установлен и производится Продавцами с 09.00 до 16.00 с понедельника по пятницу по 20 сентября 2011 г. включительно.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Открытый аукцион по продаже объектов коммунальной собственности г. Минска (далее – аукцион) состоится **23 сентября 2011 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Продавец: УП «ЖРЭО Советского района г. Минска»; 220005, г. Минск, ул. Смолячкова, 16, конт. тел. (8017) 261 24 74

Организатор аукциона: Минский городской территориальный фонд государственного имущества; 220005, г. Минск, пр. Независимости, д. 8, каб. 227, конт. тел. (8017) 200 20 89.

НА АУКЦИОН ВЫСТАВЛЯЮТСЯ ИЗОЛИРОВАННЫЕ ПОМЕЩЕНИЯ:

| 1 | Наименование и место нахождения предмета аукциона | Помещение многофункциональное с инвентарным номером 500/D-708013470 по ул. Маневича, 9, пом. 3 | Помещение общественного питания с инвентарным номером 500/D-708013471 по ул. Маневича, 9, пом. 4 | Помещение культурно-просветительного и зрелищного назначения с инвентарным номером 500/D-708013472 по ул. Маневича, 9, пом. 5 |
|---|---|---|---|---|
| 2 | Сведения о предмете аукциона | изолированное помещение площадью 120,4 кв.м расположено на 1, 2 этажах и мансарде 2-этажного здания; введено в эксплуатацию в 1952 году.<br>Стены наружные и внутренние – кирпичные, перегородки – кирпичные, перекрытия – деревянные балки, полы – дощатые и плиточные, оконные проемы – двойные деревянные, дверные проемы – филенчатые, отопление центральное (работает), электроснабжение – скрытая электропроводка (рабочая), канализация – центральная (рабочая). | изолированное помещение площадью 199,0 кв.м расположено на 1 этаже 2-этажного здания; введено в эксплуатацию в 1952 году.<br>Стены наружные и внутренние – кирпичные, перегородки – кирпичные, перекрытия – деревянные балки, полы –плиточные, оконные проемы – двойные деревянные, дверные проемы – филенчатые, отопление центральное (работает), электроснабжение – скрытая электропроводка (рабочая), канализация – центральная (рабочая), водоснабжение – стальные трубы от городских сетей. | изолированное помещение площадью 768,1 кв.м расположено на 1, 2 этажах и мансарде 2-этажного здания с мансардой; введено в эксплуатацию в 1952 году.<br>Стены наружные и внутренние – кирпичные, перегородки – кирпичные, перекрытия – деревянные балки, полы – дощатые и плиточные, оконные проемы – двойные деревянные, дверные проемы – филенчатые, отопление центральное (работает), электроснабжение – скрытая электропроводка (рабочая), канализация – центральная (рабочая), водоснабжение – от городских сетей. |
| 3 | Условия аукциона | Использование помещений под объекты общественного назначения (физкультурно-оздоровительного центра, общественного питания, торговых объектов, бытового обслуживания, помещений для работы с детьми, видеосалон, фотоуслуги и др.);<br>оплату объектов произвести в течение 30 календарных дней с даты заключения договора купли-продажи в бюджет г. Минска | | |
| 4 | Начальная цена предмета аукциона | 26 000 000 белорусских рублей | 55 000 000 белорусских рублей | 351 000 000 белорусских рублей |
| 5 | Размер задатка, порядок и сроки его перечисления, реквизиты расчетного счета | 2 600 000 белорусских рублей, до подачи заявления на участие в аукционе, путем внесения на р/с 3642000000015 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества; назначение платежа – задаток для участия в аукционе | 5 500 000 белорусских рублей, до подачи заявления на участие в аукционе, путем внесения на р/с 3642000000015 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества; назначение платежа – задаток для участия в аукционе | 35 100 000 белорусских рублей, до подачи заявления на участие в аукционе, путем внесения на р/с 3642000000015 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества; назначение платежа – задаток для участия в аукционе |

Порядок проведения аукциона определен Инструкцией о порядке организации и проведения торгов по продаже объектов, находящихся в коммунальной собственности г. Минска, утвержденной решением Минского городского Совета депутатов от 23 сентября 2009 г. № 250.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты его проведения.

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. 227, по рабочим дням с 9.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 21 сентября 2011 года.**

Победителем аукциона по лоту признается участник, предложивший наиболее высокую цену. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона по решению комиссии продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Победитель аукциона в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона при заключительной регистрации под роспись.

После предъявления организатору аукциона копии платежных документов о возмещении затрат, но не позднее 10 рабочих дней с даты проведения аукциона между продавцом и покупателем заключается договор купли-продажи.

Осмотр предмета аукциона на местности участниками аукциона производится продавцом по рабочим дням с 10.00 до 16.00 по 21 сентября 2011 г., конт. тел. (8017) 261 24 74.

Асабістае

# І ПРЫРОДА, І ПАЧУЦЦІ ЗДАВАЛІСЯ АДНОЛЬКАВА ЗМРОЧНЫМІ

**Калі ў аўтакатастрофе загінуў Віктар Цой, памятаю, мы сустрэліся з сяброўкай каля Дома культуры. Быў звычайны жнівеньскі дзень: цёплы, нават крыху спякотны, ярка свяціла сонца. А сяброўка літаральна плакала ад крыўды і непаразумення, якія, напэўна, могуць быць толькі ў юнацкім узросце: як такое магло стацца з кумірам, які прымусіў многіх паглядзець на, падавалася б, звыклы свет іншымі вачамі. І ў гэтым спалучэнні — лагоднага дня і дзявочых слёз — было нешта няправільнае, недарэчнае. Сышла зорка па імені Сонца...**

А праз лічаныя дні я зноў праходзіў праз гэта ж месца. Толькі цяпер прырода і пачуцці былі цалкам сугучныя. Было неяк пахмурна: неба «ціснула» нізкімі хмарамі, быццам збіралася навальніца ці дождж. Прадчуванне магчымага разгулу стыхіі трывожыла. Асабіста ў мяне ўвогуле чамусьці засталося ўражанне, што ўсе тыя тры дні былі нейкімі змрочнымі па ўмовы надвор'я. Як і на думкі ў галаве.

На душы было неспакойна і ад іншага: пра путч усё было вядома. Я ішоў абмяркаваць падзеі да аднаго школьнага сябра, а думаў пра іншае. Той ужо практычна заканчваў тэрміновую службу на Далёкім Усходзе, у Хабараўску. Ішоў і перабіраў у галаве радкі з ліста, які толькі што напісаў і адправіў яму. У некаторых рэспубліках ужо праліліся кроў, па тэлебачанні паказвалі, як армія ўдзельнічала ў наведзенні парадку. Я напісаў, што будзе вялікая трагедыя, калі салдаты будуць страляць у мірных людзей. Мне было страшна за свайго сябра, які таксама мог атрымаць аўтамат у рукі і загад. І выйсці, вобразна кажучы, з ім супраць мяне. Ішоў і думаў пра тое, што мы тут, цывільныя людзі, маглі нешта абмяркоўваць паміж сабой, атрымаць хоць крупінку праўды. Ці ў арміі наўрад ці дазволілі такое маім аднагодкам. Дый і прысягу краіне, якая ўжо «трашчала па швах», ніхто не адмяняў.

А затым на зялёнай сцяне дома барачнага тыпу насупраць кінатэатра пачалі з'яўляцца самаробныя плакаты, напісаныя чырвонай гуашшу. У некалькіх словах там гаварылася пра путч, пра захоп улады. Плакаты з'яўляліся цягам некалькіх дзён, тэкст быў кожны раз новы. Гэта было нечым незразумелым, чамусьці нагадвала партызанскія лістоўкі часоў вайны. Тым больш што тыя, напісаныя ад рукі, плакаты таксама заўсёды з'яўляліся пасля ночы. Напачатку яшчэ ніхто не ведаў, чым усё скончыцца, таму было і цікава, і трывожна. І за ананімнага для мяне на той момант аўтара, які не недзе там далёка, а побач, у ціхім, здавалася б, пасёлку, не пабаяўся сказаць тое, што людзі былі пачуць з экрана тэлевізара, і за магчымыя дзеянні ўладаў. Да майго вялікага здзіўлення, плакаты ніхто не чапаў, у тым ліку і міліцыя. Яны па чарзе віселі да таго часу, пакуль іх не мяняў сам аўтар. Я старанна перапісваў змест плакатаў, дадаваў некалькі радкоў ад сябе, маўляў, з'явілася чарговае ананімнае пасланне да жыхароў пасёлка, і лістамі — тэлефона, а тым больш інтэрнэту, не было — адпраўляў у «раёнку». Пасля ліставаў было некалькі. І іх друкавалі, што для мяне таксама было крыху дзіўна. Хаця, натуральна, тады ўжо было вядома, чым усё скончылася...

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# 20 ГАДОЎ ТАМУ Ў МАСКВЕ БЫЛІ ТАНКІ...

**19 ЖНІЎНЯ 1991 года ў 6 гадзін раніцы сродкі масавай інфармацыі СССР аб'явілі пра ўвядзенне ў краіне надзвычайнага становішча, пра нездольнасць прэзідэнта СССР Міхаіла Гарбачова выконваць свае функцыі «па стане здароўя» і пра пераход усёй паўнаты ўлады ў рукі Дзяржаўнага камітэта па надзвычайным становішчы (ДКНС). Адначасова ў Маскву былі ўведзены войскі... Гэтыя дні, якія атрымалі назву «Жнівеньскага путчу», назаўсёды запомніліся ўсім грамадзянам СССР — хто цікавіўся палітыкай і хто не цікавіўся — хаця б тым жа балетам «Лебядзінае возера», які трансляваўся па тэлебачанні паміж экстранымі выпускамі навін.**

**Але з таго часу прайшло 20 гадоў. Як паўплывалі гэтыя падзеі на лёс кожнага і краіны ў цэлым? Я, напрыклад, быў тады толькі 5-гадовым хлопчыкам, але нават у маёй дзіцячай памяці адбіліся гэтыя падзеі: мы тады з матуляй адпачывалі ў Балгарыі, і я памятаю, як дарослыя збіраліся ў вялікім холе санаторыя і з трывогай узіраліся ў экран — што там адбываецца на радзіме? Вайна? Пераварот?.. Я таксама прасякнуўся агульнай трывогай і нават хвілін 5 глядзеў у тэлевізар. Але, нічога не зразумеўшы, хутка страціў цікавасць да путчу. Што зробіш, зусім яшчэ малы быў... Сёння «Звязда» правяла невялічкае апытанне і спытала, як можна ацэньваць уплыў падзей жніўня 1991 года на сённяшняе жыццё.**

**Ігар КАТЛЯРОЎ, дырэктар Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі, доктар сацыялагічных навук, прафесар:**

— Перабудова прывяла да цалкам новага мыслення ў савецкім грамадстве. Наша даследаванне паказвае, што сёння пераважная большасць людзей не падтрымлівае перабудову. Бо вынікі яе, як правіла, для вельмі многіх людзей негатыўныя. Калі казаць пра тыя аспекты, якія прывялі да фарміравання такой думкі, то іх можна вылучыць некалькі. Пачнём з таго, што пасля аб'яўлення Міхаілам Сяргеевічам перабудовы праз нейкі час пачаўся эканамічны крызіс, які істотна паўплываў на жыццё ўсяго савецкага народа. Па-другое, дзякуючы менавіта перабудове ва ўсім Савецкім Саюзе з'явілася такая з'ява, як сепаратызм, пра які ніхто практычна да гэтага не ведаў. На шчасце, БССР, а затым Рэспубліка Беларусь пазбегнула гэтага — ніводная кропля крыві ў Беларусі не пралілася ў міжнацыянальных і міжканфесійных канфліктах. Па-трэцяе, рэзка пагоршыўся якасны склад і партыйных, і дзяржаўных кіраўнікоў. За час перабудовы да кіравання дзяржавай, асобнымі сферамі грамадскага жыцця, народнай гаспадаркі замест прафесіяналаў прыйшлі аматары. Нават не паўпрафесіяналы, а сапраўдныя аматары, якія падштурхнулі краіну да гэтага эканамічнага крызісу. Па-чацвёртае, тады дастаткова выразна праявіліся інтарэсы розных мафіёзных груп, рэгіянальных кланаў, якія хацелі атрымаць сабе часцінку агульнанароднага багацця... Людзі спачатку ўспрымалі перабудову вельмі прыязна, але потым аказалася, што гэта не так добра. Народныя незадаволенасці выліліся ў выніку рэферэндуму ў 1991 годзе. Але ўжо працэсы зайшлі так далёка, што асобным палітычным сілам нельга было спыніцца. Як вынік — вось гэты путч, які быў падрыхтаваны пэўнымі палітычнымі сіламі, пэўнымі лідарамі. І я яшчэ раз падкрэслю, што ў гэтай сітуацыі путч аказаўся пераломным момантам, рубіконам у жыцці вялізнай колькасці жыхароў нашай вялікай савецкай краіны. Прычым у Беларусі нам удалося пазбегнуць шмат якіх негатыўных наступстваў: прынамсі, у нас не адбылося тое, што адбылося ў Нагорным Карабаху і іншых месцах. Менталітэт у беларускага народа такі, што мы не дазволілі ў нашай краіне дапусціць гэтых праяўленняў...

— *Якія былі настроі ў той час?*

— Я тады ўзначальваў вялікую сацыялагічную структуру, адзіную, якая ў Беларусі займалася сацыялогіяй палітыкі, і мы правялі даследаванне настрояў у Беларусі незадоўга да путчу: ва ўсялякім выпадку, ніякіх сепаратысцкіх настрояў у краіне не было. Большая маса насельніцтва была ў разгубленасці. Людзі ніяк не маглі падумаць, што такое можа адбыцца. Дарэчы, цікавы момант: у савецкія часы, каб быць дырэктарам завода, рэктарам інстытута, начальнікам цэха і гэтак далей неабходна было быць абавязкова членам КПСС. І таму ў партыю пайшлі ўсе кар'ерысты, якія затым ірвалі партыйныя білеты і палілі іх на плошчы. Але цікава, што 19 жніўня яны сталі тэлефанаваць у партыйныя органы і пытаць, калі заплаціць тыя членскія ўзносы, якія яны не плацілі за апошні час... Але яшчэ раз падкрэслю, што Беларусь была талерантнай рэспублікай, можа, таму ў нас і не было тых крывавых падзей, якія былі ў цэлым шэрагу іншых рэспублік былога Савецкага Саюза.

**Уладзімір КАРАГІН, старшыня Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і наймальнікаў:**

— Я вельмі добра памятаю гэтыя падзеі. 18 жніўня я прыехаў з доўгатэрміновай стажыроўкі ў ЗША і быў у складзе ініцыятараў склікання пазачарговай сесіі Мінгарсавета. Дэпутаты Мінскага гарсавета ўжо 20 чысла выказалі сваё непрыманне путчу: больш за 100 з іх, заслухаўшы даклады прадстаўнікоў сілавых структур (МУС, КДБ), адназначна для сябе прынялі рашэнне не прымаць ідэю путча і заявілі пра гэта публічна, як і Гомельскі гарадскі савет дэпутатаў. Далейшыя падзеі і жыццё падказалі правільнасць нашай пазіцыі. Але гэта дало штуршок і суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, стварэнню нашай незалежнай дзяржавы.

— *Усе сачылі за падзеямі ў Маскве?*

— У дзень пачатку ДКНС я прыляцеў у Маскву, пабыў каля Белага дома, пабачыў калоны танкаў і адназначна прыняў рашэнне, што путч ніяк падтрымліваць нельга, пра мяне гэта было выразна і пэўна.

— *Страшна не было? Усё ж такі не кожны дзень танкі ў горадзе бываюць...*

— Не, не было. Было агідна, што нехта спрабуе зламаць канструктыўную лінію, якая намецілася, на рэарганізацыю СССР, пабудаванне рынкавай эканомікі, дэмакратычнай сістэмы. Усё такі я не быў у баку ад тагачасных працэсаў: ведаў пра Новагараўскі працэс, быў у курсе спроб гарбачоўскай адміністрацыі рэфармаваць краіну, удзельнічаў у шмат якіх дыскусіях наконт пошуку метадаў вырашэння гэтых праблем, ведаў пра магчымыя пазітыўныя сцэнары вырашэння праблем. І такая спроба сілавым метадам усё спыніць, безумоўна, выклікала ў мяне яркае непрыняцце.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

Дзённікі
Сшыткі
Алоўкі
Пасцікі
Ручкі

І ўсё неабходнае для вашага вучня
Вы можаце набыць у крамах і кіёсках
РУП «БЕЛСАЮЗДРУК»
РУП "Белсаюздрук" УНН 100071552

ГАЗ

Все, что нужно для вашего автомобиля ГАЗ – есть у нас!

| | |
|---|---|
| **Брестская область:** | |
| г. Брест, ул. Сикорского, 45 | (0162) 44 86 99 |
| Брестская обл., г. Береза, ул. Ленина, 108/3 | (01643) 4 29 45 |
| Брестская обл., г. Пинск, ул. 60 лет Октября, 15 | (0165) 34 22 00 |
| Брестская обл., г. Барановичи, ул. Пролетарская, 48 | (0163) 48 45 82 |
| **Витебская область:** | |
| г. Витебск, пр. Строителей, 11 | (0212) 23 85 40 |
| Витебская обл., г. Полоцк, ул. Строительная, 15 к. 2 | (0214) 43 57 55 |
| **Гомельская область:** | |
| Гомельский р-н, г. Гомель, ул. Советская, 179а | (0232) 93 57 68, 93 57 67 |
| Гомельская обл., г. Калинковичи, ул. Советская, 18 | (02345) 4 60 27, 4 60 26 |
| Гомельская обл., г.п. Октябрьский, пер. Озерный, 2 | (02357) 5 20 85, 5-11-09, 5-41-12 |
| Гомельская обл., г. Жлобин, ул. Козлова, 50-1 | (02334) 3 20 31, 3 20 08 |
| **Гродненская область:** | |
| г. Гродно, пр-т Космонавтов, 60ж | (0152) 74 11 91, 74 26 66, 74 40 14 |
| **Минская область:** | |
| г. Минск, ул. Бабушкина, 25 | (017) 291 83 42 |
| г. Минск, пр. Жукова, 44 | (017) 220 63 64 |
| г. Минск, ул. Игнатенко, 2/1 | (017) 203 61 92 |
| г. Минск, ул. Филимонова, 25 б | (017) 389 70 55, 389 70 56 |
| Минская обл., г. Клецк, ул. Казарменная, 8 | (01793) 5 35 83 |
| Минская обл., г. Борисов, ул. Днепровская, 58 | (0177) 79 38 01, 79 55 52 |
| **Могилевская область:** | |
| г. Могилев, ул. Якубовского, 26 | (0222) 27 92 83 |

www.belgaz.by

## ПАДЛЕТАК ТРАПІЎ ПАД КОЛЫ

**13-гадовы падлетак трапіў пад колы машыны на вуліцы Чыгуначнай у Драгічыне. Кіроўца легкавіка адрэагаваць не паспеў: школьнік выбягаў на праезную частку з-за аўтобуса. У выніку ДТЗ хлопчык атрымаў цяжкую траўму — пераломам асновы чэрапа.**

Паводле інфармацыі ДАІ Брэсцкай вобласці, сёлета ў рэгіёне адбылося 55 дарожна-транспартных здарэнняў з удзелам дзяцей. У іх загінулі 10 непаўналетніх, яшчэ 51 дзіця атрымала раненні. Адна з самых распаўсюджаных прычын аварый — нечаканы выхад маленькіх пешаходаў на праезную частку з-за сустрэчнага транспарту або машын, якія стаяць.

## ДЗВЕ АХВЯРЫ

Як ужо паведамлялася ў газеце, 2 жніўня пад Брэстам на замежным прадпрыемстве «Ліндэ Газ Бел» прагрымеў выбух. Будынак помпавай станцыі быў поўнасцю знішчаны. Пад заваламі аказаліся два работнікі прадпрыемства, якія атрымалі цяжкія траўмы. Абодва былі роднымі братамі. Старэйшы, 32-гадовы, памёр у Брэсцкай абласной бальніцы 6 жніўня. За жыццё малодшага, 24-гадовага, урачы змагаліся яшчэ тыдзень. Але выратаваць хлопца таксама не ўдалося. Па факце выбуху следства праводзіцца.

**Яна СВЕТАВА.**

Рэверс з сеціва

# «ГАЛОЎНЫ СРОДАК «ЗААХВОЧВАННЯ» НАСТАЎНІКА ПАКУЛЬ — СТРАХ ПАКАРАННЯ?»

**У нумары «Звязды» за 16 жніўня было змешчана інтэрв'ю журналісткі газеты Надзеі Нікалаевай з міністрам адукацыі нашай краіны Сяргеем Маскевічам, прысвечанае праблемам сучаснай школы («Імідж прафесіі педагога — тэма выключнай важнасці»). Чытачы «Звязды» зноў не засталіся абыякавымі. Даём ім слова.**

@

Вельмі рады вяртанню настаўніцкай тэмы на старонкі «Звязды». Значыць, ёсць шанц праўдзіва абмеркаваць нялёгкае школьнае жыццё. Цяперашнім часам часта ўжываюць слова «матывацыя». Але чамусьці толькі ў адносінах да вучня. Тэма здаровай матывацыі педагога, здаецца, не існуе. Адміністрацыя школы ахвотней ухіляецца ад падобных спрэчак, чым падтрымлівае іх.

І што мы маем на выхадзе? Галоўны дырэктарскі сродак заахвочвання пакуль — страх пакарання. На ім школа пакуль што трымаецца, але праз яго і загіне, калі не змяніць сітуацыю. Ці я не маю рацыю?

**Базыль.**

@

Навучальны год яшчэ не пачаўся, а стос папер ужо прыйшоў! У школу страшна ісці! Міністр адукацыі кажа, што ў гэтым райвыканкамы вінаватыя, але настаўніку ад гэтага не лягчэй! Дашліце ім паперку таксама, якая забараняе з настаўнікаў рабіць рабоў! І такую ж самую ў школы!

А колькі конкурсаў, выстаў! Як толькі падумаеш аб конкурсе «Настаўнік года», то рукі і ногі трасуцца. У перыяд падрыхтоўкі і правядзення яго дзеці не вучацца, а настаўнікі п'юць валідол.

**Святлана.**

@

Учора сяброўку выкінулі са школы. Проста так! Дырэктар патэлефанавала дадому і павеламіла, каб шукала працу ў іншым месцы, бо гадзін для яе ў школе няма. І гэта нягледзячы на тое, колькі ўсяго малады і таленавіты выкладчык зрабіла для школы — прызавыя месцы на выставах, конкурсах, у тым ліку рэспубліканскіх (прэміі, вядома, ніхто не выплачвае). На жаль, дзяўчына не выкладае англійскую мову ці матэматыку. Яна ўсяго толькі настаўнік малявання і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Ну і што, што яна падабаецца дзецям? У сувязі з гэтым хочацца спытаць, чым абумоўлена рэзкае скарачэнне колькасці гадзін малявання і працоўнага навучання? Калі жорсткай эканоміяй, то як тады патлумачыць, што замест іх у школе ўводзяцца дапрызыўная і ваенная падрыхтоўка? На аўтамат грошы ёсць, а на мастацтва — няма? А наконт стаўлення да настаўніка, то яно шмат у чым залежыць ад кіраўнікоў на месцах. Інакш як растлумачыць той факт, што майму бацьку (а ён таксама настаўнік) грамату за першае месца ў абласным конкурсе «вярнулі» праз 12 гадоў? І не проста вярнулі, а літаральна падкінулі пад дзверы. У свой час уручыць кіраўніцтва забылася, а мо і знарок, вырашылі на прэміі зэканоміць?

**Volga.**

@

На спецыяльнасць «Фізіка. Матэматыка» пры плане прыёму 50 чалавек было пададзена ўсяго 33 заявы, а на «Фізіку. Інфарматыку» пры плане 65 чалавек паступаў 61 абітурыент. На 20 месцаў спецыяльнасці «Фізіка. Тэхнічная творчасць» прэтэндавалі ўсяго 14 абітурыентаў. На незапоўненыя месцы фізфака было дазволена залічыць не прайшоўшых па конкурсе на матэматычны факультэт, але ўсё роўна пры плане набору на два факультэты 270 чалавек 14 бюджэтных месцаў засталіся незанятымі. Што ўжо толькі не рабіла Міністэрства адукацыі?! Інтэрнат давалі, стыпендыі павышалі... Павысьце лепш заработную плату гэтай катэгорыі работнікаў — і сцены ВНУ не вытрымаюць патоку ахвотных! Навошта ім, «двоечнікам», месца ў інтэрнаце і павышаную стыпендыю даваць? Іх да школы і блізка падпускаць нельга! За што такія выгоды? Каму? Усё роўна мала хто з іх пойдзе ў школы працаваць. Каму праз пяць гадоў мы даверым дзяцей? Яшчэ горш будзе, калі праз 5 гадоў дзяржава схамянецца і павысіць зарплату. Але зноў, для каго? Гэтыя невукі мала таго што дзяцей будуць калечыць, дык яшчэ і зарплату высокую за гэта атрымліваць? Ужо зараз большасць настаўнікаў матэматыкі, фізікі, хіміі сядзіць з «рашэбнікамі». На ўроках інфарматыкі дзеці заняты толькі камп'ютарнымі гульнямі, паколькі іх настаўнікі далёкія ад праграміравання і новых ПС. У школе за такую зарплату можна адсядзецца, пакуль новую працу не знойдзеш...

**Анатоль Сафонаў.**

**Падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.**

# Фінскія стыпендыі таленавітым лідчанам

**Пяцёра юных лідчан атрымалі сертыфікаты на стыпендыю фінскага фонду OLVI — некамерцыйнай арганізацыі, якая аказвае фінансавую падтрымку таленавітай моладзі ў сферах культуры, адукацыі і спорту.**

Гэта сумесны праект Лідскага райвыканкама, ААТ «Лідскае піва» і яго акцыянера кампаніі OLVI. Стыпендыі (агульная сума — 5 тысяч еўра) атрымалі 17-гадовы выхавальнік дзіцячага дома, навучэнец вучылішча алімпійскага рэзерву Іван Клім, 14-гадовая гімназістка Дар'я Шымуль (за спартыўныя дасягненні), лаўрэат трох прэмій спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі 16-гадовая Ірына Мінец, а таксама 17-гадовы трэцякурснік Лідскага музычнага вучылішча Яўген Амбражук і 11-гадовая школьніца Наталля Тананушка, якія вызначыліся на міжнародных конкурсах выканаўцаў і мастакоў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ ОБ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ГРОДНЕНСКОГО РАЙОННОГО ПОТРЕБИТЕЛЬСКОГО ОБЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| Здание магазина | Здание магазина (капитальное строение с инвентарным номером 400/С-69246), площадь застройки 87,0 м.кв., объем здания 257 м.куб., общая площадь здания 77,4 м.кв., фундамент – бетонный, наружные и внутренние стены – брусчатые, крыша – асбестоцементные листы, электроснабжение – проводка, ветиляция – естественная |
| Местонахождение объекта | Гродненская область, Гродненский район, дер. Калеты |
| Земельный участок | Площадь земельного участка 0,0760 га, назначение – для обслуживания здания магазина |
| Начальная цена продажи | 26 000 000 белорусских рублей с учетом НДС. |
| Сумма задатка | 2 600 000 белорусских рублей с учетом НДС. |
| Продавец | Гродненское районное потребительское общество, 230003, г. Гродно, ул. Озерское шоссе, д. 41, тел. 74 68 07 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41 98 32, 41 98 34 |
| Условия аукциона | Без условий |
| Условия оплаты | По договоренности сторон |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | Р/с 3012286350011, отделение № 201 г. Гродно, ГФ по Гродненской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 152101705, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 22 сентября 2011 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:
заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;
*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;
*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:
представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;
физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;
представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.
Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209 с 8.30 до 17.30. Последний день приема заявлений – 21 сентября 2011 г. до 15.00.**

**Телефоны для справок: 41 98 32, 41 98 34 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».**

Соцыум

# БЫЛЫЯ РОДНЫЯ

## *Каб не бегаць па судах, не бойцеся заключаць пагадненне пры рэгістрацыі новых членаў сям'і*

**КАЛІ даводзілася гартаць судовыя справы, пра якія пойдзе гаворка ніжэй, зноў і зноў успаміналася памятнае жыглоўскае: «Пакаранняў без віны не бывае... Урэшце, трэба было своечасова разбірацца са сваімі жанчынамі». Вось і пра пенсіянера з аднаго з палескіх раёнаў хочацца сказаць тое самае.**

### Грамадзянскі муж

Пражыў чалавек ладны адрэзак, нажыў шасцярых дзяцей, а ў канцы таго жыцця аказаўся нікому не патрэбны. Як высветлілася ў ходзе судовага пасяджэння, Віктар Адамавіч і зараз фармальна знаходзіцца ў шлюбе з былой жонкай і мае, дарэчы, ва ўласнасці дом. Але даўно ў афіцыйнай сям'і не жыве. Больш за дзесяцігоддзе вясковец пражыў з новай грамадзянскай жонкай у яе гарадской кватэры, дзе быў зарэгістраваны да гэтага часу. Але з гадамі наваліліся хваробы, чалавек перанёс інфаркт, стаў інвалідам першай групы і цяпер мае патрэбу ў пастаянным доглядзе. У грамадзянскай жонкі Галіны Дзмітрыеўны тым часам таксама пагоршылася здароўе, яна пераехала да сына ў суседнюю краіну. А дачцэ Галіны Дзмітрыеўны, якая жыве ў спрэчнай кватэры са сваімі дзецьмі, такі «грамадзянскі» айчым аказаўся зусім лішнім.

Калі ён чарговы раз выпісаўся з бальніцы, маладая гаспадыня паказала на дзверы. Таму і перасяліўся сталы чалавек у дом сваёй дачкі. Тым часам у суд паступіла заява з просьбай прызнаць, што ён страціў права на рэгістрацыю і пражыванне ў гарадской кватэры. Дачка ж Віктара Адамавіча падтрымлівала імкненне бацькі адстаяць свае правы на знаходжанне ў кватэры Галіны Дзмітрыеўны. Ды толькі суд не палічыў прэтэнзіі грамадзянскага мужа ўласніцы кватэры абгрунтаванымі. Бо з пункту гледжання закона, грамадзянскі муж — ніхто, чужы дзядзька. А тое, што ён некалі жыў у кватэры, магчыма, рабіў рамонт, — яго асабістая справа. Хоць і спрабаваў былы вясковец абскардзіць рашэнне раённага суда, абласны суд пакінуў тое рашэнне без змены. Віктар Адамавіч па-ранейшаму застаўся ў доме дачкі. А вось даглядае яго, інваліда першай групы, як паведаміў сельсавет, сацыяльны работнік. Іншых ахвотных не знайшлося.

### Унучка

Не вельмі хацела даглядаць састарэлых бабулю і дзядулю і адна брастаўчанка, чый іск фігураваў у судзе. У свой час старыя знайшлі чалавека, з якім заключылі дагавор рэнты з умовай пажыццёвага ўтрымання, гэта азначала, што ён дагледзіць старых і атрымае кватэру. Дагавор быў складзены па правілах і засведчаны натарыяльна. А вось калі старыя людзі памерлі, іх унучка раптам вярнулася з суседняй краіны, дзе яна апошнім часам падпрацоўвала, і заявіла правы на кватэру. Паколькі яе бацька, адзіны сын дзядулі і бабулі, памёр, сябе яна палічыла законнай спадчынніцай маёмасці старых. Пры гэтым да суда жанчына спрабавала давесці, што яе дзед і бабка пакутавалі на псіхічныя захворванні, таму не разумелі сутнасці дакументаў, якія падпісвалі.

У ходзе судовага разбору высветлілася, што сталыя брастаўчане сапраўды былі вельмі хворымі, і не толькі на псіхічныя расстройствы. Іх стан здароўя патрабаваў і догляду, і медыкаментаў, якімі і забяспечыў іх чужы чалавек. Унучка ж, калі яны хварэлі і не маглі сябе абслугоўваць, не цікавілася іх станам, не дапамагала, нават не прапаноўвала дапамогу. Таму і лагічным, і справядлівым выглядае рашэнне суда, які пацвердзіў поўнае права на кватэру чалавека, які дагледзеў старых людзей.

### Цётка і пляменніца

Вось так бывае, што былыя родныя становяцца амаль што ворагамі, калі справа даходзіць да дзяльбы маёмасці. А здараецца, людзі зробяць нейкі крок, падораць, перапішуць жыллё на сваяка, а потым апомняцца, але, як правіла, позна. Вось і сёстры з Баранавіч, відаць, былі ў найлепшых адносінах, падтрымлівалі адна адну, дапамагалі, калі старэйшая падарыла малодшай аднапакаёвую кватэру. Падарыла з належным афармленнем здзелкі, з подпісам усіх дакументаў. А малодшая незадоўга да смерці падарыла названую кватэру сваёй дачцэ. Вось цётка і спадзявалася, што пляменніца ў знак удзячнасці за кватэру будзе яе даглядаць, дапамагаць. Толькі так па нейкіх прычынах не сталася. Ды гэта ўжо катэгорыі маральныя. А паводле закона, кватэра належыць маладой жанчыне, якая распараджаецца ёй і паводзіць сябе так, як лічыць патрэбным.

Тады цётка спахапілася, палічыла пляменніцу недастойнай і звярнулася ў суд з просьбай прызнаць дагавор дарэння несапраўдным. Але як гэта зрабіць? Маральныя аспекты да справы не прывяжаш, а фармальныя былі захаваны. Таму няма ніякай магчымасці вярнуць кватэру яе былой уласніцы. Можна толькі паспачуваць жанчыне і на яе прыкладзе паказаць іншым, якімі небяспечнымі могуць быць крокі па перадачы ўласнага жылля нават самым блізкім сваякам.

### Муж і ключы ад кватэры

Паводле слоў **намесніка старшыні Брэсцкага абласнога суда Алены ХАЦЬКО**, найчасцей судам даводзіцца разбіраць сямейныя спрэчкі сваякоў наконт рэгістрацыі і права пражывання ў кватэрах і дамах. Людзі рэгіструюць у сваім жыллі мужоў і жонак, нявестак і зяцёў, а пасля скасавання шлюбу нярэдка маюць вялікія праблемы. І ўсё таму, што не ведаюць законаў, не цікавяцца жыллёвым заканадаўствам і не прымаюць меры па забеспячэнні сваіх правоў. Для нашага чалавека зусім ненатуральным выглядае пры прапісцы мужа ці жонкі падпісаць пагадненне аб карыстанні жыллём. І дарэмна, пры наяўнасці такога пагаднення ў выпадку скасавання шлюбу кожны застаецца, з чым быў. А калі ўлічыць статыстыку разводаў, то варта сем разоў падумаць. І павучыцца на чужым горкім вопыце.

Тыповая гісторыя: у Брэсце пажаніліся двое, жонка зарэгістравала мужа ў кватэры, якую яна купіла да шлюбу. Не вельмі каб шчаслівым аказалася тое сямейнае жыццё маладых гараджан, калі праз паўтара года яны вырашылі расстацца. Развод афармілі, як і шлюб, у вызначаным законам парадку. Ну, і, вядома, жонка спадзявалася, што экс-муж збярэ чамаданчык ды ціха сыдзе з яе жыцця. Каб паскорыць працэс, яна нават замкі змяніла ў кватэры. Толькі ў мужа былі іншыя планы, ён законы ведаў. І падаў у суд. Суд у сваю чаргу, яму, як былому члену сям'і, выдзеліў пакой, у якім ён можа пражываць хоць да скону. А другі суд абавязаў экс-жонку выдаць ключы ад уваходных дзвярэй, ды яшчэ спагнаў з яе на карысць былога мужа 400 000 рублёў, якія ён патраціў на адваката.

Здзівіліся? Няма чаго. Такія ў нас законы. На мове афіцыйных дакументаў гэта гучыць так: калі члены сям'і ўласніка жылога памяшкання перасталі быць членамі яго сям'і, але пражываюць у гэтым памяшканні, яны захоўваюць свае правы і абавязкі. А калі сказаць проста, былога мужа ці жонку, калі вы іх прапісалі ў сваю кватэру, вы не выпішаце ніколі, пакуль ён сам таго не пажадае. У яго няма права на ўласнасць, калі кватэра набывалася да шлюбу. Але навошта яму такое права, калі ў кватэры можна жыць і судом можна прымусіць былога сужэнца аддаць ключы?

У Германіі, напрыклад, пасля разводу жанчыны атрымліваюць шмат пераваг. Былы муж, незалежна ад наяўнасці і ўзросту дзяцей, плаціць аліменты на ўтрыманне жонкі пажыццёва. У нас жа, як бачым, можна жонку прымусіць пажыццёва ўтрымліваць мужа, прадастаўляючы яму жылплошчу ў сваёй кватэры. І няважна, што ў пакупку кватэры ён не ўнёс ні капейкі, не важна, што яна жыве тут з новай сям'ёй і дзецьмі, няважна, што былы муж — гэта ніхто, такі ж «сваяк», як сусед па пляцоўцы або алкаголік з пад'ездаўскай лавачкі. Такі закон, і ніводзін суд яго не абыдзе.

### Цывілізаваная рэгістрацыя

Закон, вядома, можна памяняць. Але таго найперш павінны захацець дэпутаты, якіх мы з вамі рэгулярна і дружна выбіраем. Яшчэ павінна быць заканадаўчая ініцыятыва. Хочацца думаць, што яна, тая ініцыятыва, усё ж пратопча сцежку ў парламент. Бо цяперашні закон, на думку аўтара гэтых радкоў, не зусім састыкуецца з Артыкулам 44-м нашай Канстытуцыі, які гарантуе кожнаму права ўласнасці і дзяржаўную абарону гэтага права.

А пакуль закон такі, які ёсць. І з гэтым трэба лічыцца. Вядома, напісаць у пагадненні аб парадку карыстання жыллём, што сваяк рэгіструецца на час шлюбу, для нашага чалавека амаль што азначае прызнанне гэтага шлюбу часовым. Але ж можна ў ЖЭСе альбо ў старшыні кааператыва заключыць пагадненне спачатку на пэўны тэрмін: на год, два, пяць. Не саромеюцца ж працадаўцы браць спецыяліста ці рабочага на працу з выпрабавальным тэрмінам. Дык чаго ж саромецца тут, калі рэгіструеш у сваім жыллі зяця ці нявестку, а то і мужа ці жонку? Час пакажа, працягваць тэрмін пражывання альбо не. І нават запіс «на час шлюбу» не выглядае абразлівым, калі шлюб заключаецца на ўсё жыццё. Проста загадзя трэба абгаварыць гэтыя моманты з чалавекам і рабіць усё цывілізавана, не асабліва зважаючы на эмоцыі, рэплікі, паводзіны таго, хто ўсяляецца. Заўсёды можна сказаць яму, што ў сваё ўласнае жыллё ён зможа ўсяляць каго захоча і як захоча, а тут хай выконвае правілы гульні гаспадара.

Варта прызнаць, што нават не вельмі прыемная размова з новым родзічам лепш, чым судовыя цяжбы з вядомым фіналам. Некаторыя гаспадары кватэр гадамі, а то і дзесяцігоддзямі пакутуюць побач з былымі сваякамі. Гэта перарастае ў зацяжныя канфлікты, сапраўдныя войны, у выніку якіх траціцца спакой, сілы і здароўе. Асабліва калі былы муж п'е, вядзе адпаведны лад жыцця, што і паслужыла прычынай разводу. Асобныя людзі ў такіх сітуацыях знаходзяць выйсце ў тым, што купляюць пакой у іншай кватэры і перасяляюць вымушанага кватаранта туды. Ды лепей усё ж узважыць магчымыя наступствы загадзя.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

